Источник: "Гродзенская праўда" - 2012-06-23

# Гальшаны пастарэюць?

## Знаходкі навукоўцаў падчас раскопак могуць паставіць пад сумненне ўзрост Гальшан

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Гальшанскія чытанні" ў гэтым годзе прайшла пад знакам юбілею. Бо чытанні ж – пятыя, і на кожных з іх навукоўцы прадстаўлялі цікавыя даследчыя работы.

Традыцыя праводзіць Гальшанскія чытанні на Ашмяншчыне пакідае не толькі грунтоўныя даследаванні, але і добры знак на зямлі. Так, **тэмай першай навукова-практычнай канферэнцыі** стала дынастыя Ягелонаў і асоба Соф'і Гальшанскай як заснавальніцы гэтай слыннай каралеўскай дынастыі. На рынкавай плошчы Гальшан удзельнікі канферэнцыі тады ўсталявалі памятны знак Соф'і Гальшанскай, які стаў адным з брэндаў вёскі.

**Тэмай даследаванняў наступных канферэнцый** сталі праблемы рэгіянальнай гісторыі Беларусі, замкі і сядзібы Ашмяншчыны, культурная і гістарычная прастора мястэчкаў Ашмяншчыны. А на ашмянскай зямлі з'явіліся помнікі – гэадэзічны пункт Дугі Струве ля вёскі Цюпішкі, помнік экіпажу самалёта "Ілья Мурамец", збітаму немцамі падчас першай сусветнай вайны ў Барунах.

**Тэма сёлетніх чытанняў** – "Гісторыка-культурная спадчына Ашмяншчыны". Да яе грунтоўна рыхтаваліся не толькі навукоўцы, але і ашмянскія краязнаўцы, школьнікі і работнікі культуры. Сапраўдным адкрыццём для ўдзельнікаў сёлетняй канферэнцыі стала наведванне старажытнага гарадзішча і раскопак, якія правялі археолагі. Знойдзены фундаменты сцяны. Навукоўцы датуюць знаходку XI–XII стагоддзем, а далейшыя раскопкі могуць паставіць пад сумненне дату заснавання Гальшан, першыя звесткі пра якія ў пісьмовых крыніцах датуюцца 1280 годам.

**Малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Павел Кенька**, які на працягу трох гадоў займаецца археалагічнымі раскопкамі на Гальшанскім гарадзішчы, расказаў пра цікавыя знаходкі, якія можна аднесці да розных эпох – ад V да XVI стагоддзя. Падчас раскопак знайшлі культурныя слаі XI–XII стагоддзяў, а таксама адзін ачаг, які сведчыць, што ўжо ў пятым стагоддзі тут сяліліся людзі. Сярод знаходак і такая ўнікальная, як крыж пачатку XIII стагоддзя, а таксама наканечнікі коп'яў, зашпількі. Аб'ект, які археолагі знайшлі ў 2011 годзе і які прапанавалі для прагляду ўдзельнікам канферэнцыі, – каменная вымастка і фрагмент падмурка сцяны, у якім засталіся наканечнікі коп'яў.

### КАМПЕТЭНТНА

**Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН РБ, доктар гістарычных навук, прафесар:**

– Доўгі час рэгіянальная гісторыя была полем дзейнасці мясцовых краязнаўцаў. Навукоўцаў цікавілі больш фундаментальныя праблемы. Арганізаваныя ў 2006 годзе першыя Гальшанскія чытанні далі штуршок развіццю навуковых даследаванняў найперш у Гальшанах, а потым і ў іншых мястэчках Беларусі. За гады, што прайшлі з першай канферэнцыі, у розных рэгіёнах рэспублікі зладзілі больш за 120 навукова-грамадскіх мерапрыемстваў.

З навуковымі дакладамі на канферэнцыі выступілі не толькі вучоныя, але вучні школ Ашмяншчыны.

Сярод прыемных момантаў канферэнцыі – прэзентацыя сюіты кампазітара Ганны Кароткінай "Гальшаны", а таксама канцэрт духоўнай музыкі ў касцёле Яна Хрысціцеля.



Фота аўтара

"Горад майстроў" на "Карнавале стагоддзяў"

**На наступны дзень у Гальшанах ля руін былога замка Сапегаў ладзіўся "Карнавал стагоддзяў".**

Так арганізатары назвалі трэці фестываль "Гальшанскі замак-2012", заснавальнікамі якога, як і ў мінулыя гады, сталі Ашмянскі райвыканкам і турыстычнае агенцтва "Гісторыя-Тур". Былі арганізаваны майстар-класы па танцах, кавальскай справе, ткацтву. У "Горадзе майстроў", які разгарнуўся ля сцен старажытнага замка, таксама былі гатовы навучыць кожнага жадаючага свайму рамяству. Канешне, да ўдзелу ў рыцарскіх турнірах кожнага ахвотніка не дапускалі – тут патрэбны спрыт і гарт, а вось прымерыць на сябе амуніцыю рыцара, пракаціцца на кані, пастраляць з лука – калі ласка.

А на сцэне тым часам віравала дзейства. Спачатку гасцей прывіталі самадзейныя артысты з Гальшанаў, потым гістарычны тэатр "Падарожжа ў сярэднявечча" з Ліды ладзіў спектакль "Сватаўство Ягайлы да Соф'і Гальшанскай". Цікавасць выклікалі міні-спектакль "Вайна 1812 года", конны рыцарскі турнір, канцэрт старажытнай музыкі з удзелам груп "Яварына", "Стары Ольса" і "Тутэйшыя", а таксама DJ-праект "ПАВА".

Наталія ВАЛЫНЕЦ